# Гісторыя

Л.В. МІКАЛАЕВА

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў 10–20-х ГАДАХ XVI ст.

Рассматриваются основные действия Великого княжества Литовского по реализации внешней политики на трех основных направлениях: восточном, западном и южном. Делается вывод о том, что, несмотря на достаточную активность, главная цель внешней политики ВКЛ – обеспечение безопасности и сохранение территориальной целостности государства – достигнута не была.

The detailed consideration of the main directions in the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania is given. The conclusion is that the main aim of the Grand Duchy of Lithuania foreign policy of securing safety and keeping the territory of state as one whole was not reached.

Асноўныя факты і падзеі, што склалі змест знешнепалітычных акцый Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) у 10–20-х гг. XVI ст., сродкі, формы і метады іх рэалізацыі былі прадвызначаны тым гістарычным фонам, на якім яны адбываліся. Прааналізуем расстаноўку сіл на гэты перыяд з мэтай вызначыць асноўныя накірункі развіцця падзей.

ВКЛ у гэты час па-ранейшаму з пункта гледжання тэрыторыі заставалася адной з самых вялікіх дзяржаў у тагачаснай Еўропе, але фактычна на ўсім працягу сваіх межаў яно было ўцягнута ў спляценне цяжкасцей і канфліктаў. На ўсходнім і паўночна-ўсходнім флангах Княства межавала толькі з адной дзяржавай – Вялікім княствам Маскоўскім, і менавіта гэта суседства стала галоўнай крыніцай знешнепалітычных праблем беларуска-літоўскага гаспадарства, адначасова адцягваючы асноўную ўвагу як дыпламатаў, так і ваенных і прама ці ўскосна ўплываючы на развіццё адносін з астатнімі суседзямі. На маскоўскім троне ў гэты час знаходзіўся вялікі князь Васіль III (1505–1533), які працягваў агрэсіўную палітыку свайго бацькі Івана III (1462–1505) і ў 1508 г. здолеў замацаваць за сабой зробленыя бацькам захопы літоўскіх тэрыторый у выніку так званага “вечнага” міру[1]. Такім чынам, на пачатак разглядаемага перыяду суадносіны сіл у рэгіёне змяніліся яўна не на карысць ВКЛ. Кіраўніцтва Княства ўсведамляла як неабходнасць рэваншу, так і тое, што “вечны” мір не мог зменшыць заваёўніцкі пыл усходніх суседзяў. Таму дасягненне раўнавагі на ўсходнім флангу стала жыццёва неабходным для далейшага захавання тэрытарыяльнай цэласнасці беларуска-літоўскай дзяржавы. На паўднёвым флангу асноўным асяродкам небяспекі заставалася Крымскае ханства, хоць у 1507 г. быў заключаны крымска-літоўскі саюз[2], асноўнымі .рычынамі падпісання якога з боку татар, відавочна, былі паражэнне пад Клецкам 5 жніўня 1506 г. ад войска ВКЛ, узмацненне Масквы, былога саюзніка Крыма, у чым крымскі хан Менглі-Гірэй угледзеў небяспеку для становішча сваёй арды, а таксама знаходжанне ў руках вялікага князя літоўскага Жыгімонта Казіміравіча (1506–1544) саперніка Менглі-Гірэя за-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

волжскага хана Шыг-Ахмата, пагроза вызвалення з няволі якога бясспрэчна адцягвала Менглі-Гірэя ад саюзу з Масквой. Але, нягледзячы на заключэнне саюзу, наезды крымчакоў не спыняліся. Чарговы з іх адбыўся ўжо ў 1508 г.[3], а ў 1510 г. крымчакі ледзь не дайшлі да Вільні[4]. Таму можна канстатаваць, што крымска-літоўскі саюз 1507 г. не прынёс рэальнай карысці ВКЛ, бо не мог гарантаваць бяспеку паўднёвых межаў Княства .

Малдаўскае княства, даўні саюзнік Масквы, у 1509 г. пачало ваенны канфлікт з Польшчай, звязанай з ВКЛ персанальнай уніяй, які скончыўся паражэннем малдаўскага гаспадара Багдана і падпісаннем 23 студзеня 1510 г. у Камянцы Падольскім міру з Польшчай[5]. Пры гэтым праблема Пакуцця, спрэчнай тэрыторыі паміж Малдавіяй і Польшчай, па-ранейшаму засталася нявырашанай, ствараючы ачаг напружання на паўднёва-ўсходняй мяжы Кароны. Да таго ж не было гарантыі, што ў выпадку пачатку вайны з Масквой малдаўскі гаспадар не падтрымае Васіля III супраць Вялікага княства Літоўскага, калі той паабяцае дапамогу ў справе Пакуцця.

Самым спакойным адрэзкам мяжы Княства быў заходні, па якому праходзіла граніца з Польшчай, даўнім партнёрам і саюзнікам ВКЛ, звязаным з ім персанальнай уніяй, з якім працягвалася цеснае збліжэнне. На заходнім флангу заставаліся не маючыя з Княствам непасрэдных граніц, але саюзныя з ім дзяржавы Венгрыя і Чэхія, на чале якіх знаходзіўся Уладзіслаў, старэйшы брат Жыгімонта. Але і тут існавала важная крыніца непакою ў асобе Імперыі Максіміліяна I Габсбурга (1493–1519), які імкнуўся да заняцця тронаў Венгрыі і Чэхіі і падтрымліваў незалежную палітыку вялікіх магістраў Тэўтонскага ордэна адносна адмаўлення прынясення прысягі Жыгімонту, а таксама непрызнання ўмоў Торуньскага міру 1466 г. і быў схільны да непасрэдных кантактаў і наладжвання саюзных адносін з Масквой, ствараючы тым самым дадатковыя праблемы для Жыгімонта і адцягваючы яго ўвагу ад дапамогі Уладзіславу. Таму на паўночна-заходнім флангу, дзе праходзіла мяжа з дзяржавай Ордэна тэўтонаў у Прусіі і яе Лівонскай філіяй, таксама не было поўнага заспакаення, нягледзячы на выбары 13 лютага 1511 г. вялікім магістрам Тэўтонскага ордэна пляменніка Жыгімонта і Уладзіслава па сястры Альбрэхта Гогенцоллерна-Ансбахскага[6], а таксама на тое, што яшчэ заставалася ў сіле лівонска-літоўская саюзная дамова 1501 г. Такім чынам, на пачатак 10-х гг. XVI ст. ВКЛ знаходзілася ў складанай знешнепалітычнай сітуацыі, на пошукі выйсця з якой і былі накіраваны асноўныя намаганні кіраўніцтва краіны. Асноўным праціўнікам Княства заставалася Маскоўская дзяржава, і ў сувязі з гэтым прыярытэты ўсходняга накірунку знешняй палітыкі ВКЛ заставаліся нязменнымі з канца XV ст. Галоўнымі знешнепалітычнымі мэтамі ў гэтым напрамку былі вяртанне страчаных зямель як сродкамі дыпламатыі, так і ваеннай сілай, а таксама прадухіленне новых тэрытарыяльных захопаў з боку Масквы, што прадвызначыла правядзенне шэрага абарончых мерапрыемстваў на ўсходняй мяжы, дзе з моманту заключэння "вечнага" міру адбываліся пастаянныя сутычкі. Да таго ж Васіль III досыць цікава трактаваў "вечнасць" міру 1508 г., бо ўжо восенню 1512 г. сваім смаленскім паходам парушыў яго, паклаўшы пачатак чарговай маскоўска-літоўскай вайне, якая доўжылася з кароткімі перапынкамі і рознай інтэнсіўнасцю да 1522 г. Да яе пачатку мелі дачыненне не толькі наезды Менглі-Гірэя на Маскву, але і варожая Ягелонам палітыка Максіміліяна I, які прыклаў усе намаганні да стварэння кааліцыі ў складзе імперыі, Масквы і Тэўтонскага ордэна з магчымым далучэннем да яе Лівонскага ордэна, Саксоніі, Брандэнбурга і Даніі, асноўны ўдар якой накіроўваўся па ўладаннях Жыгімонта. У ВКЛ саюзнікаў амаль не было, бо на Венгрыю і Чэхію цяжка было разлічваць, Менглі-Гірэю пагражалі нагаі, а Польшча займалася абвастрыўшайся справай з Тэўтонскім ордэнам і намагалася за сваю дапамогу атрымаць ад Княства пацвярджэнне інкарпарацыйнай уніі 1501 г. Таму дапамога па-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

лякаў абмежавалася наймам за грошы некалькі тысяч жаўнераў[7]. Падчас вайны адбыўся шэраг значных падзей, дзве з якіх не толькі паўплывалі на ўзаемаадносіны абедзвюх краін, але і выклікалі еўрапейскі рэзананс. Гаворка ідзе пра захоп маскоўскімі войскамі Смаленска ў канцы ліпеня 1514 г. у выніку трэцяй яго аблогі і паражэнне масквітаў 8 верасня 1514 г. пад Оршай ад удвая па колькасці меншага земскага апалчэння ВКЛ, узмоцненага атрадамі польскіх наёнікаў. Страта Смаленска азначала парушэнне раўнавагі сіл у рэгіёне. З гэтага часу перавага была на баку Масквы, якая ў 1514 г. заключыла антыягелонскі саюз з Максіміліянам І (ад якога апошні адступіў ужо ў 1515 г.)[8]. Затое перамога войска ВКЛ пад Оршай, якая разглядалася пры двары Жыгімонта як рэванш за страту Смаленска, стварыла магчымасць выкарыстання знешнепалітычнай лрапаганды як важнага ідэалагічнага сродку ў справе барацьбы за прыхільнае да Княства меркаванне ў краінах Еўропы і выкрыццё ролі Максіміліяна ў справе распальвання варожасці паміж хрысціянскімі ўладарамі. Пасля адзначаных падзей вайна цягнулася без рашучага змагання і пасля шэрага няўдалых спроб літоўскіх дыпламатаў заключыць мір, асноўнай умовай якога было вяртанне ўсіх захопленых раней тэрыторый ВКЛ (восень 1517 г. – пасольства магілёўскага намесніка Яна Шчыта і пісара Богуша Багавіцінавіча[9], жнівень 1520 г. – пасольства падляшскага ваяводы Яна Косцевіча і падскарбія Богуша Багавіцінавіча[10]), скончылася падпісаннем пяцігадовага перамір'я, якое 14 верасня 1522 г. заключыла ў Маскве літоўскае пасольства ў складзе полацкага ваяводы Пятра Кішкі, падскарбія Богуша Багавіцінавіча і пісара Івана Гарнастая[11]. Перамір'е замацавала межы 1508 г., але са значным выключэннем, бо Смаленск застаўся за Масквой. ВКЛ захавала за сабой шматлікі маскоўкі палон[12]. Адразу ж пасля заключэння перамір'я пачаліся новыя сутычкі на памежжы, аб чым неаднаразова скардзіліся ў Маскве і Вільні пасланнікі Жыгімонта і Васіля III. Таму можна канстатаваць, што ўмовы перамір'я парушаліся абодвума бакамі, асноўнымі прычынамі чаго былі як недакладна праведзеная мяжа, так і курс на пастаянную канфрантацыю, узяты Масквой. Не ўдалося дабіцца падпісання міру і ў лістападзе 1526 г., калі на перамовах разам з літоўскім пасольствам Пятра Кішкі і Богуша Багавіцінавіча прысутнічалі ў якасці пасрэднікаў паслы Карла і Фердынанда Габсбургаў Леанард Коміт і Жыгімонт Герберштэйн і легат папы рымскага Клімента VII біскуп Ян Франчэска Цітус дэ Патэнцыя[13]. У выніку перамоў перамір'е было прадоўжана на шэсць гадоў на тых жа ўмовах. А скаргі Жыгімонта на парушэнне перамір'я прывезла ў Маскву маскоўскае ж пасольства, што ездзіла па перамірную грамату вялікага князя літоўскага і вярнулася назад 27 красавіка 1527 г.[14] Падобныя скаргі складалі асноўны змест усіх маскоўскіх і літоўскіх пасольстваў да канца разглядаемага перыяду. Паведамленняў жа пра вырашэнне "обидных дел" няшмат. Таму можна канстатаваць, што і ў "перамірныя" гады ў адносінах паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай працягвалася канфрантацыя, што адбілася і на асноўных прынцыпах дыпламатыі абедзвюх дзяржаў. Такім чынам, у 10–20-я гг. XVI ст. на ўсходнім напрамку асноўныя знешнепалітычныя мэты дасягнуты не былі. Тут не толькі не вярнулі старыя страты, але не ўдалося пазбегнуць і новых, хоць дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага і не спяшалася іх прызнаваць. Пры гэтым трэба прызнаць, што памежжа з Масквой было адзіным адрэзкам мяжы, дзе перавага перад дыпламатыяй аддавалася зброі, але і ваенныя сродкі таксама аказаліся не вельмі эфектыўнымі. Увага ж на абарончыя мерапрыемствы, звязаныя з прывядзеннем памежных замкаў у належны стан, была звернута ў асноўным толькі пасля страты Смаленска – значнага стратэгічнага цэнтра, займаўшага ў пэўным сэнсе выключнае становішча сярод усходніх крэпасцей Княства. Няздольнасць адваяваць Смаленск сведчыла аб канчатковай страце ВКЛ сваёй ваенна-наступальнай ініцыяты-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

вы і недахопе патэнцыялу для захавання сваёй тэрытарыяльнай цэласнасці. А дасягненне былой раўнавагі з Масквой стала амаль немагчымым. Таму даводзілася задавальняцца палавінчатымі метадамі, якімі былі неаднаразовыя заключэнні перамір'яў, што давалі некаторае заспакаенне, але не здымалі напружання.

На паўднёвым накірунку асноўнымі знешнепалітычнымі мэтамі былі забеспячэнне спакою межаў дзяржавы ад набегаў крымчакоў і адцягванне Крыма і Малдавіі ад удзелу ў антылітоўскіх кааліцыях, ствараемых Масквой. Пэўнага спакою на межах удалося дабіцца толькі пасля разгрому татарскіх загонаў 28 красавіка 1512 г. пад Вішняўцом. А заключаны пасля гэтага крымска-літоўскі саюз не толькі стварыў часовую бяспеку на паўднёвай мяжы, але і накіраваў татарскія загоны на спусташэнне маскоўскіх зямель. Пасля смерці вясной 1515 г. Менглі-Гірэя літоўскай дыпламатыі ўдалося перацягнуць на свой бок новага хана Мухамед-Гірэя, які ў 1516 г. аднавіў крымска-літоўскі саюз. Але аператыўнасць маскоўскіх дыпламатаў выявілася ў наездзе часткі непадпарадкаваўшыхся татарскіх загонаў на землі Вялікага княства Літоўскага ў тым жа 1516 г., а ў 1518 г. разлік паставіць крымскага царэвіча на чале Казанскага ханства схіліў Мухамед-Гірэя да саюзу з Васілём III. Канчатковым адыходжаннем хана ад саюзу з Жыгімонтам быў адзначаны 1519 г., што выявілася ў спусташальных наездах крымчакоў на Валынь, Кіеўшчыну і Люблін, зробленых па просьбе Васіля III. Калі ж апошні паставіў у Казані сваю марыянетку Шэйх-Алея, Мухамед-Гірэй звярнуўся да Жыгімонта з прапановай аднавіць стары саюз. У Крым быў накіраваны Астафей Гарнастай, які ў 1521 г. вярнуўся разам з паслом хана, што прывёз даканчальную грамату на вечны мір[15]. У тым жа годзе брат хана Сахіб-Гірэй захапіў Казань і ў ліпені крымска-казанскае войска пры ўдзеле атрада чаркаскага старосты Дашковіча рушыла на маскоўскія землі. Увосень 1522 г. Жыгімонт паспрабаваў арганізаваць сумесны ўдар па Маскве, але Мухамед-Гірэй не згадзіўся на гэта[16]. Сітуацыя на паўднёвай мяжы пагоршылася, калі ў 1524 г. у Крыме ўсталяваўся Сеадзет-Гірэй. У адказ на наезды татар літоўскі бок прыняў адэкватныя меры супрацьдзеяння як з дапамогай ваенных сродкаў (напрыклад, бітва на р. Альшаніцы 5 лютага 1527 г., калі 3,5-тысячнае войска гетмана К.І. Астрожскага разграміла 25-тысячнае татарскае войска і вызваліла 40-тысячны палон[17]), так і сродкаў палітычных. Ужо ў 1525 г. у Крыме пачаліся ўнутраныя ўскладненні, удала арганізаваныя літоўскай дыпламатыяй, пераросшыя ў адкрытае супрацьстаянне паміж Сеадзет-Гірэям і яго пляменнікам Іслам-Гірэям, якога і падтрымліваў літоўскі бок. Акрамя таго, ліцвіны нарэшце выпусцілі з нявол хана Шыг-Ахмата, даўняга ворага Гірэяў, ізноў узрасла пагроза крымчакам ад рэшткаў Вялікай Арды. Вынікам гэтых акцый стала часовае заспакаенне на паўднёвых межах, хоць у той жа час памяншалася і магчымасць выкарыстання татар супраць Масквы. Такім чынам, можна меркаваць, што адносна Крыма знешнепалітычныя мэты былі дасягнуты, бо занятыя ўнутранымі ўсобіцамі крымчакі адмовіліся і ад нападаў на ВКЛ, і ад саюзу з Масквой. У адносінах з Малдаўскім княствам на працягу ўсяго разглядаемага перыяду значных змен не адбылося, але адцягнуць яго ад заключэння саюзу з Масквой усё ж не ўдалося, што сведчыць пра няўдачу ў дасягненні асноўнай знешнепалітычнай мэты ў гэтым напрамку.

Асноўнымі знешнепалітычнымі мэтамі на заходнім накірунку былі супрацьдзеянне варожай палітыцы Габсбургаў і пошук саюзнікаў супраць Масквы, у чым Княства ў першую чаргу імкнулася абаперціся на дзяржавы Ягелонскай кааліцыі – Польшчу, Венгрыю, Чэхію. На ўсім працягу разглядаемага перыяду рэальнай асновай саюзу ВКЛ з Польшчай заставалася персанальная унія. Праўда, у 1512–1514 гг. палякі ўздымалі прапановы пацвярджэння уніі 1501 г., якая так і не была ратыфікавана ў свой час



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

літоўскім бокам. Але і на гэты раз справа не зайшла далей перамоў[18]. Пры гэтым адзначым, што паміж абедзвюма дзяржавамі працягваўся працэс збліжэння, што выявілася і ў лепшай каардынацыі дзеянняў па пытаннях знешняй палітыкі, хоць апошняя заўвага справядлівая толькі для тых выпадкаў, калі гаворка ішла пра справы, што аднолькава закраналі як інтарэсы Княства, так і Польшчы. Часцей жа бывала так, што палякі траплялі ў сітуацыі тых партнёраў, якія больш хацелі разлічваць на дапамогу ліцвінаў, чым яе аказваць самім. Таму Княства не раз заставала сам-насам са сваімі праблемамі, што не спрыяла паразуменню з Каронай, даўняй марай якой была інкарпарацыя Вялікага княства. Тое ж, што гэтага пакуль удавалася пазбегнуць пры адначасовым захаванні уніі, сведчыла пра пэўныя знешнепалітычныя поспехі ў гэтым напрамку. Саюзнікамі Княства заставаліся таксама Венгрыя і Чэхія, але разлічваць на іх дапамогу было цяжка. У лепшым выпадку можна было спадзявацца толькі на дыпламатычную і маральную падтрымку, а пасля згасання ў 1526 г. мясцовай лініі дынастыі Ягелонаў нават гэта стала праблематычным, бо ў выніку шэрага памылковых крокаў польскай дыпламатыі Жыгімонт прайграў Габсбургам у спрэчцы за кароны гэтых дзяржаў.

Галоўным праціўнікам на Захадзе па-ранейшаму заставаліся Габсбургі. Заключэнне Максіміліянам Габсбургам у 1514 г. саюзу з Масквой стала асноўнай прычынай удзелу Жыгімонта ў Венскім кангрэсе 1515 г., дзе быў падпісаны знакаміты трактат, адным з пунктаў якога было заключэнне саюзу паміж Максіміліянам і Жыгімонтам. Пры гэтым першы разрываў свой саюз з Масквой і адмаўляўся ад падтрымкі сепаратысцкай лалітыкі Ордэна[19]. Гэта мела вялікае значэнне, бо наносіла значны ўдар па Маскве. Але Максіміліян таксама не застаўся ў пройгрышы, бо астатнія пункты трактата ўмацоўвалі становішча Габсбургаў у Венгрыі і Чэхіі. Змена ж сітуацыі ў Еўропе, калі ў 1519 г. пасля смерці Максіміліяна імператарам стаў яго ўнук, іспанскі кароль Карл, прымусіла Жыгімонта ў 1524 г. заключыць антыгабсбургскі саюз з каралём Францыі Францыскам I. Але пасля паражэння пад Павіяй у 1525 г., калі Францыск трапіў у палон да Карла, надзеі на партнёрства з Францыяй амаль зніклі. Такім чынам, спробы супрацьдзеяння варожай палітыцы Габсбургаў не мелі належнага поспеху.

Падводзячы вынікі, можна канстатаваць, што галоўная мэта знешняй палітыкі Княства – дасягненне бяспекі і захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы – цалкам дасягнута не была, нягледзячы на належную актыўнасць на ўсіх асноўных накірунках. Асноўныя прычыны гэтага можна бачыць як ва ўзмацненні ў сілу заваяванняў асноўнага праціўніка ВКЛ Маскоўскай дзяржавы, так і ў неаператыўнасці і непаваротлівасці літоўскай дыпламатыі, а таксама ў адсутнасці належнай увагі да ўзятых на сябе абавязацельстваў з боку кіраўніцтва краіны. Усё выразней пачало праяўляцца аслабленне ваенна-палітычнага патэнцыялу Княства, што адмоўна адбілася на яго міжнародным аўтарытэце, асабліва пасля таго, калі да старых пралікаў дабавіліся новыя. Сітуацыя ўскладнялася яшчэ тым, што ВКЛ ужо амаль не мела сіл для выпраўлення хаця б часткі з іх. Станавілася відавочна, што былая веліч беларуска-літоўскага гаспадарства паступова адыходзіла ў мінулае.

[1] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 8. Вильнюс, 1995. С. 125–128.
[2] Гл.: Литовская метрика... С. 84, 85.
[3] Гл.: Литовская метрика... С. 129; Historia dyplomacji Polskej. Warszawa, 1982. S. 619.
[4] Гл.: Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссиею (далей – АЗР). СПб., 1848. Т. 2. С. 79.
[5] Гл.: Литовская метрика... С. 129; Historia dyplomacji Polskej. S. 618.
[6] Гл.: Монархи Европы: Судьбы династий. М., 1997. С. 24.
[7] Гл.: Любавский М.К. Литовско-русский сейм. М., 1900. С. 199, 200.
[8] Гл.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 588. Арк. 14; Historia dyplomacji Polskej. S. 621.
[9] Гл.: НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 588. Арк. 1–57.
[10] Гл.: Там жа. Арк. 98–130.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

[11] Гл.: Там жа. Арк. 200–203.
[12] Гл.: Там жа. Арк. 211–217; АЗР. Т. 2. С. 148–151.
[13] Гл.: Там жа. Арк. 321.
[14] Гл.: Там жа. Арк. 394–399.
[15] Гл.: Любавский М. К. Указ. тв. Приложение. С. 10.
[16] Гл.: АЗР. Т. 2. С. 143–146; Литовская метрика. Книга записей 11. Вильнюс, 1997. С. 117–119.
[17] Гл.: Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. М., 1994. С. 67.
[18] Гл.: Любавский М. К. Указ. тв. С. 193–200.
[19] Гл.: Historia dyplomacji Polskej. S. 641.

Паступіў у рэдакцыю 02.06.2002.

***Людміла Віктараўна Мікалаева*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоў.

*С.У. ЧАРНОЎ*

## ТРАКТАТ МІХАЛОНА ЛІТВІНА "О НРАВАХ ТАТАР, ЛИТОВЦЕВ И МОСКВИТЯН" ЯК КРЫНІЦА ПА ДАСЛЕДАВАННЮ ЗНОСІН ПАМІЖ РАСІЯЙ І ВЯЛІКІМ КНЯСТВАМ ЛІТОЎСКІМ У КАНЦЫ XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

Анализируется информация об отношениях России и ВКЛ конца XV – первой половины XVI в., содержащаяся в трактате литовского дипломата середины XVI в. Михалона Литвина "О нравах татар, литовцев и москвитян". Автор статьи приходит к выводу, что взгляд М. Литвина на развитие русско-литовских отношений является более объективным, чем у современных ему литовских и польских авторов, что делает трактат весьма ценным источником для исследования международных отношений в Восточной Европе XV–XVI вв.

The present article is devoted to the analysis of the information about the relations of Russia and Great Duchy of Lithuania in the end of XV c. – first half XVI century which is contained in the tract of the Lithuanian diplomat (middle XVI century) Michalon Litwin: "About customs and traditions of Tatars, Lithuanians and Muscovites". The author concludes that M. Litwin's point of view concerning the development of the relations between Russia and Lithuania is characterized by a greater degree of objectivity in the assessments, than that of other Lithuanian and Polish authors, his contemporaries, what makes the tract rather valuable for the historians who work on the problems of the International relations in Eastern Europe XV-XVI century.

У першай палове XVI ст. Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ) увайшло ў паласу знешнепалітычнага крызісу, адной з праяў якога сталі няўдачы ў войнах з суседнімі дзяржавамі, перш за ўсё з Расіяй і Крымскім ханствам. Частка літоўскіх магнатаў і шляхты меркавала, што Княства не ў стане выйсці з гэтага крызісу самастойна; на іх думку, найбольш зручны варыянт вырашэння знешніх праблем ВКЛ састаяў у набыцці надзейнага і моцнага саюзніка, на ролю якога па шэрагу прычын прэтэндавала Польскае каралеўства. Але патрыятычна настроеныя прадстаўнікі шляхты лічылі, што існуюць і іншыя шляхі пераадолення крызісу, – паколькі першапрычына знешніх няўдач, на іх думку, была ў недарэчнасцях унутранага жыцця краіны, то, ліквідаваўшы іх, можна будзе адолець і знешнія праблемы.

Адным з прыхільнікаў такога шляху быў аўтар скпадзенага ў палове XVI ст. трактата "О нравах татар, литовцев и москвитян", які падпісаў сваё сачыненне псеўданімам Міхалон Літвін. Гэты трактат – свайго роду праграма пераўтварэнняў, накіраваных на ўмацаванне ўнутранага і знешняга стану Княства. Ён быў паданы ў 1550 г. каралю Сігізмунду Аўгусту, напэўна, з надзеяй на тое, што малады манарх, зусім нядаўна стаўшы адзіным гаспадаром ВКЛ і Польшчы, прыме да ўвагі меркаванне аўтара і паспрабуе пераадолець памылкі, зробленыя яго папярэднікамі на польска-літоўскім троне. Абаснаванне неабходнасці перамен у трактаце робіцца шляхам параўнання парадкаў, існуючых у Літве і ў дзвюх суседніх з ёй дзяржавах – Маскоўскай Русі і Крымскім ханстве. Відавочна, што гэтыя дзяржавы выбра-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm